*Працоўныя будні шэфаў*

# У САЎГАСЕ «РЭЧКІ»

Ужо не першы год наш універсітэт шэфствуе над саўгасам «Рэчкі» Веткаўскага раёна, Бадай, ніколі яму не аказвалася такая актыўная дапамога, як сёлета. Яшчэ вясной быў заключаны дагавор аб вырошчванні на 160 гектарах кармавых буракоў і гародніны. Партыйны камітэт і рэктарат універсітэта своечасова прынялі ўсе меры для таго, каб выканаць узятыя перад саўгасам абавязацельствы. Былі ўсебакова прадуманы пытанні выдзялення людзей з усіх факультэтаў і падраздзяленняў і арганізацыя іх працы.

Пасланцы універсітэта займаліся ў гаспадарцы не толькі доглядам вырошчваемых культур, але і іншымі неадкладнымі справамі, асабліва калі патрабавалася мужчынская сіла.

Мы наведалі саўгас «Рэчкі» у ліпені. Тут працавала 76 чалавек чацвёртай змены. Непадалёку ад цэнтральнай сядзібы вёўся падбор зацюкаванай канюшыны. Тут вялікай старанасцю на пагрузцы вызначалася звяно на чале з дацэнтам П. Д. Грыгаруком. Даводзілася нялёгка: асобныя цюкі важылі да 40 кг. Адзін з членаў звяна ўкладваў іх на трактарны прычэп, двое — падавалі (на здымку). Прыемна было адчуваць тую заклапочанасць, з якой працавалі члены звяна. Кожны з іх штодзённа імкнуўся перавыканаць заданне.



На ўкладцы цюкоў у сцірты ўзоры працы паказаў дацэнт кафедры палітэканоміі Я. П. Кульбацкі.

У той жа дзень 14 чалавек было занята на касьбе траў. Высокае ўменне і загартоўку прадэманстравалі ў гэтай нялёгкай справе старшы выкладчык кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны В. Д. Падасінаў, загадчык кафедры оптыкі А. М. Сердзюкоў, супрацоўнік гэтай кафедры А. Ц. Малашчанка, дацэнт кафедры беларускай мовы А. А. Парукаў, іншыя касцы.

Спорылася работа і на праполцы пасеваў морквы. Ад найбольш старанных жанчын Г. А. Круглікавай, А. М. Гадлеўскай, Н. М. Канашэвіч, В. І. Харламавай, В. Р. Свірыдзенка не адставалі і мужчыны, такія як дацэнт В. У. Матусевіч, М. Н. Мурашка з кафедры гісторыі КПСС, А. І. Канашэвіч з кафедры палітэканоміі.

Калі настаў час абедаць, усе прысутныя шчыра дзякавалі сваіх павароў Г. І. Гаўрылаву і М. М. Царанок з кафедры нямецкай і французскай моў.

Перад нашым прыездам у саўгасе пабываў вакальна-інструментальны ансамбль універсітэта «Радзімічы», які выступіў з канцэртам на адкрытай пляцоўцы. Самадзейныя артысты былі цёпла прыняты рабочымі саўгаса і мясцовай моладдзю.

...Праз кожны тыдзень у саўгас прыбывалі новыя атрады выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Папераменна за дзве змены тут адпрацавала каля 120 студэнтаў матэматычнага, эканамічнага і фізічнага факультэтаў. І хоць не заўсёды ствараліся належныя ўмовы для работы, іншы раз было нараканні на харчаванне, тым не менш з кожным днём памнажаліся працоўныя здабыткі шэфаў. На іх рахунку — дзесяткі гектараў прапалатай гародніны і скошаных траў, высушанага, згрэбленага, пагружанага і застагаванага сена. Значная дапамога аказана на ўборцы і апрацоўцы вырашчанага ўраджаю зерневых, у правядзенні іншых сельскагаспадарчых работ. У саўгасе працавала ўжо 423 выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта. На гэтым дапамога не закончана. Яна будзе працягвацца восенню.

**В. ВАЛОДЗІН.**

Фота А. Карніенкі, У. Чысціка.



**На касьбе траў.**



**Высушанае сена — ў копы.**

*З практыкі геолагаў*

# ЗАПАМЯТАЕЦЦА НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Патрабаванні да геалагічных практык былі распрацаваны яшчэ ў пачатку нашага стагоддзя вядучымі геолагамі краіны. Але калі раней асноўнымі інструментамі пазнання былі геалагічны малаток і розум, то цяпер геолагі ўзброены геадэзічнай, геафізічнай, гідрагеалагічнай, інжынерна-геалагічнай апаратурай, шырока выкарыстоўваюць сучасную вылічальную тэхніку. А здымкі з самалётаў і штучных спадарожнікаў Зямлі дазваляюць адкрыць або ўдакладніць канфігурацыю геалагічных структур і раёнаў размяшчэння карысных выкапняў. Такім чынам, цяпер разам з вывучэннем горных парод і геалагічных працэсаў студэнт-геолаг на практыцы павінен навучыцца працаваць на прыборы, буравой устаноўцы, авалодаць новымі метадамі даследавання. Таму патрабаванні да практык узрастаюць з году ў год.

На геалагічным факультэце ўсе практыкі дзеляцца на вучэбныя (пасля першага і другога курсаў) і вытворчыя — на старэйшых курсах.

Першакурснікі ў гэтым годзе праходзілі палявую практыку па маршруту Лоеў —Мазыр — Оўруч — Іршанск, азнаёміліся з буйнымі агаленнямі і кар'ерамі Беларусі і Украіны. Кіраўніцтва геалагічнай практыкай ажыццяўляў прафесар Г. А. Кузняцоў. Студэнты замацавалі тэарэтычныя веды па курсу агульная геалогія, набылі першыя навыкі экспедыцыйных даследаванняў. На тэрыторыі Гомельскай і Жытомірскай абласцей яны даследавалі кар'ер кварцавых пяскоў каля Лоева, наведалі Глушкаўскі, Оўручскі, Ігнатпальскі і іншыя кар'еры і руднікі.

У час практыкі студэнты правялі грамадска-палітычную работу: выступілі з канцэртам у піянерскім лагеры «Прыпяць», прачыталі лекцыі, арганізоўвалі захапляючыя спартыўныя спаборніцтвы з мясцовай моладдзю.

Незабыўныя ўражанні пакінула ў будучых геолагаў прырода Палесся. Акрамя геалагічнай, студэнты праходзілі тапаграфічную практыку ў раёне вёскі Барталамееўка. Кіраўнікамі яе былі дацэнт В. П. Карташоў і асістэнт М. М. Сярдзюк.

Вучэбная практыка па геакартаванню і фізічных метадах разведкі ў другакурснікаў праходзіла ў раёне г. Канева Чаркаскай вобласці. Кіраваў ёй дацэнт І. С. Лазараў. Асаблівасць гэтай практыкі заключалася ў тым, што замест доўгага маршрута праводзілася сістэматычнае геалагічнае картаванне вучэбнага палігону з выкарыстаннем геафізічнай апаратуры.

Грамадска - палітычная практыка студэнтаў уключала палітінфармацыі, выпуск насценных газет, фотагазет. У Доме культуры вёскі Бобрыцы наладжваліся канцэрты. Студэнты зрабілі цікавую экскурсію на месцы пахавання народнага паэта Украіны Т. Р. Шаўчэнкі, пісьменніка і байца Аркадзя Гайдара, у музей, запаведнік. Рабяты аказалі таксама вялікую дапамогу Бобрыцкай сярэдняй школе і калгасу імя Шаўчэнкі. Кожную суботу студэнты разам з выкладчыкамі выязджалі на сельскагаспадарчыя работы, за што былі ўзнагароджаны Ганаровай граматай мясцовага калгаса. Па лініі таварыства «Веды» праведзена 18 мерапрыемстваў.



Цікавай была сёлета практыка ў першакурснікаў геалагічнага факультэта. Перад ад'ездам група рабят сфатаграфавалася на Лоеўшчыне каля р. Днепр.

Студэнты 2-га курса выкарыстоўвалі на практыцы геафізічную апаратуру і пад кіраўніцтвам дацэнта М. В. Мыцыка авалодвалі геафізічнымі метадамі разведкі. На чале з дацэнтам Ю. Ф. Хадакоўскім яны займаліся бурэннем свідравін на палігоне ў г. Мазыры і вывучэннем асноўных тыпаў буравых установак.

Трэцякурснікі атрымліваюць практычныя веды непасрэдна ў партыях і атрадах Краснаярскага, Іркуцкага і Бурацкага геалагічных упраўленняў. У перыяд першай вытворчай практыкі яны займаюць штатныя пасады рабочых і тэхнікаў. Асноўная мэта практыкі — авалоданне студэнтамі ўсімі відамі даследаванняў, якія суправаджаюць геалагічную здымку, — выконваецца ў цэлым паспяхова. Нашым выхаванцам давялося спазнаць разам з рамантыкай падарожжа і пэўныя цяжкасці: доўга чакаць верталёта і лётнага надвор'я, каб дабрацца да бліжэйшага населенага пункта.

Закончылася і другая вытворчая (пераддыпломная) практыка ў студэнтаў 4-га курса, якая праходзіла на тэрыторыі Беларусі і Паволжжа. Выкладчыкі кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі, якія кіравалі ёю, імкнуліся да таго, каб студэнты авалодалі шырокім комплексам даследаванняў і сабралі матэрыял для напісання дыпломнай работы.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

